ЮБІЛЕІ

# ДАБРА І НОВЫХ ТВОРЧЫХ ЗДАБЫТКАЎ!

**У гэтым месяцы свой 25-гадовы юбілей адзначае факультэт педагогікі і псіхалогіі дзяцінства Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. З нагоды такой адметнай падзеі мы ўзялі інтэрв'ю ў дэкана факультэта, кандыдата педагагічных навук Ірыны Анатольеўны КАМАРОВАЙ, якое і прапануем сёння чытачам часопіса «Пралеска».**

**? — *Ірына Анатольеўна, давайце пазнаёмім нашых чытачоў з факультэтам у момант яго юбілею. Колькі ў вас зараз кафедраў, выкладчыкаў, студэнтаў?***

— Вядома ж, не так мала, як некалі. Факультэт пачынаў сваю дзейнасць толькі з адной кафедры — кафедры педагогікі і методык дашкольнага выхавання. Цяпер у нас ужо чатыры кафедры: педагогікі дзяцінства і сям'і; спецыяльных псіхолага-педагагічных дысцыплін; псіхалогіі; педагогікі. Працуе больш за 50 выкладчыкаў, палавіна з іх — кандыдаты навук. Зразумела, калектыў амаль цалкам жаночы.

Што да студэнтаў: на завочнай форме навучання іх звыш адной тысячы, на дзённай — каля 400 чалавек. Прыкладна палавіна займаецца на платнай аснове.

**? — *Давайце ўдакладнім спецыяльнасці, якія можна атрымаць на вашым факультэце.***

— Мы рыхтуем, як тое і належыць, работнікаў дашкольных устаноў. Дакладна: спецыялістаў з кваліфікацыяй «Педагог», па спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя». І дадаткова адну з дзвюх спецыяльнасцей — «Практычная псіхалогія» або «Сацыяльная педагогіка», з наступнага навучальнага года будзе яшчэ і «Лагапедыя». Гэта датычыць і дзённай, і завочнай форм навучання. Такія спецыялісты цяпер запатрабаваны, таму мы іх і рыхтуем.

**? — *А раней каго рыхтаваў факультэт? Скажам, у той час, калі вучыліся тут вы самі?***

— Я лічу, тады была ўдалая кваліфікацыя: «Выкладчык дашкольнай педагогікі і псіхалогіі. Метадыст па дашкольным выхаванні». Цяпер, бачыце, гучыць больш сціпла: «Педагог». Хацелася, каб статус выхавальніка быў і гучаў больш высока. У самой назве спецыяльнасці, лічу, трэба закладваць і таго ж менеджэра дашкольнай адукацыі, і намесніка загадчыка па асноўнай дзейнасці, і выхавальніка-метадыста... Мяркую, што ў бліжэйшыя гады мы ўсё ж да гэтага прыйдзем і на старшых курсах увядзём яшчэ і спецыялізацыю, больш канкрэтную і актуальную. Напрыклад, па фізічным выхаванні — вы ведаеце, што ў нас працуе выдатны спецыяліст у гэтым напрамку прафесар В.А. Шышкіна. Па выяўленчай дзейнасці, экалогіі...

**? — *Мяркую, чытачам часопіса будзе цікава даведацца, з чаго і як пачынаўся факультэт?***

— Магу адказаць досыць канкрэтна: з пяці чалавек, якія прадстаўлялі дзве знакамітыя навуковыя школы. Н.В. Седж, Р.Л. Няпомнячая — ленінградскую, Р.І. Афанасьева, В.А. Шышкіна, В.А. Аніпчанка — маскоўскую. Яны самі стваралі факультэт, самі набіралі першых 50 студэнтаў, самі арганізавалі і [illegible]ялі ўвесь н[illegible]працэс...

Наогул наш факультэт адасобіўся ад педагагічнага факультэта. Першых выпускнікоў — зразумела, лепшых — накіравалі ў аспірантуру, каб падрыхтаваць свае выкладчыцкія кадры. У ліку іх была і я.

**? — *Выходзіць, вы першая выпускніца факультэта?***

— Не, я з трэцяга выпуску. Але да аспірантуры паспела папрацаваць выхавальнікам у дзіцячым садзе.

**? — *Карэнная магіляўчанка?***

— Так, карэнная. Аднак яслі-сад не любіла і хадзіла туды з вялікімі цяжкасцямі. Мяне выхоўвала бабуля, толькі ў пяць гадоў бацькі аддалі ў дзіцячы сад, каб падрыхтаваць да школы і адаптаваць у калектыве.

**? — *Ці памятаеце нумар п[illegible]го дзіцячага сада?***

— Вядома, нумар 8. Але ж ён быў старэнькі, прыстасаваны, таму цяпер там знаходзіцца ўжо іншая ўстанова. У мяне была выдатная выхавальніца Ганна Адамаўна! Яна цяпер ужо ў даволі сталым узросце, і калі сустракаемся, заўсёды заўважае: «Ірачка, няўжо ты сваё жыццё прысвяціла таму, чаго так не любіла?..»

**? — *Чаму ж так адбылося?***

— Ва ўсім вінаватыя бацькі. Яны — педагогі, маці — матэматык, бацька — выкладчык фізкультуры.

...я А. А. Куляшова
Аддзел перыядычных выданняў

І, дарэчы, яны аддалі мяне ў школу ў шэсць гадоў. Пасля заканчэння школы прапанавалі пайсці на факультэт дашкольнага выхавання, раілі, што гэта вельмі цікавая і неабходная для жанчыны прафесія. Безумоўна, яны мелі рацыю — гэта я пасля зразумела.

Тады я захаплялася музыкай, марыла займацца толькі ёй. Аднак у час вучобы паступова, дзякуючы вось тым цудоўным пяці жанчынам-выкладчыкам сапраўды пераканалася ў выключнай вабнасці і значнасці прафесіі выхавальніка. Пасля інстытута я ўжо лёгка, з жаданнем пайшла ў яслі-сад № 103 г. Магілёва, тады новенькі, з басейнам. Працавала выхавальнікам падрыхтоўчай групы, нават паспела паўдзельнічаць у гарадскім конкурсе прафесійнага майстэрства і, дарэчы, стаць яго пераможцам.

***? — Відаць, там вас заўважылі і прапанавалі перайсці працаваць на факультэт?***

— Магчыма. Але на факультэце доўга не затрымалася — ужо праз тры месяцы мяне накіравалі ў аспірантуру НДІ дашкольнага выхавання Акадэміі педагагічных навук СССР у Маскву. Маім навуковым кіраўніком была вядомы спецыяліст у галіне экалагічнага выхавання Святлана Мікалаеўна Нікалаева.

***? — Дык вось адкуль ваша захапленне экалагічным выхаваннем дзяцей!***

— Так, не хаваю — ад яе! Яна доўга мяне выпрабоўвала, нават праверыла, ці ўмею я працаваць з дзецьмі. Пасля разам вызначылі спецыялізацыю — раслінны свет. Вось так я стала спецыялістам у галіне экалагічнага выхавання. Абаранілася, вярнулася на факультэт, стала старшым выкладчыкам, дацэнтам, пасля ўзначаліла кафедру і вось ужо шосты год працую дэканам.

***? — Такім чынам, на базе дзвюх школ — маскоўскай і ленінградскай — нарадзілася трэцяя — беларуская?***

— Гэта так. Зараз наш факультэт уяўляе кангламерат трох школ: маскоўскай, піцерскай і беларускай. Мы актыўна супрацоўнічаем, маем адпаведныя дагаворы і з Расійскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя А.М. Герцэна і Маскоўскім Цэнтрам дашкольнага дзяцінства імя А.В. Запарожца, які з'яўляецца пераемнікам НДІ дашкольнага выхавання АПН СССР. Хаця цяпер у нас ёсць свая аспірантура, у тым ліку і па дашкольнай адукацыі, мы імкнёмся абнаўляць свае кадры, выкарыстоўваючы магчымасці розных навуковых школ.

***? — Я ведаю, што вы актыўна супрацоўнічаеце з Магілёўскім педагагічным каледжам імя К.Д. Ушынскага і ў навуковым, і ў метадычным, і ў навучальным накірунках. Скажыце колькі слоў пра гэта.***

— Усё правільна. Апроч таго, нашы навучальныя планы сінхранізаваны і выпускнікоў каледжа па выніках дзяржаўных экзаменаў мы залічваем на завочнае аддзяленне з паскораным, двухгадовым тэрмінам навучання. Навучальныя планы ўдакладняюцца, дапрацоўваюцца на пасяджэннях сумесных творчых аб'яднанняў. Супрацоўніцтва наша, зазначу, карыснае, апраўданае, перспектыўнае.

Такое ж зацікаўленае супрацоўніцтва ў нас і з абласным інстытутам павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў. Там пастаянна арганізуюцца аўтарскія курсы нашых выкладчыкаў па фізічным, экалагічным, сацыяльна-маральным выхаванні, методыцы Мантэсоры і інш. Чытаем лекцыі па розных курсах, у тым ліку і па рабоце з сям'ёй, падрыхтоўцы дзяцей да школы. Маем адпаведныя дагаворы.

Актыўна супрацоўнічаем з аналагічнымі факультэтамі ўсіх ВНУ нашай краіны, Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі, Цэнтрам дашкольнага дзяцінства. Маем свае базавыя дзіцячыя сады, эксперыментальныя пляцоўкі, ажыццяўляем навуковае кіраўніцтва...

***? — Ірына Анатольеўна, студэнцтва, моладзь — гэта ж цэлы вулей людзей няўрымслівых, палкіх, ініцыятыўных. Як арганізуеце іх жыццё-быццё?***

— Хутчэй яны арганізуюць яго самі. І паверце — вельмі насычана, цікава. Напрыклад, калі ў мяне сапсаваны настрой, я заўсёды іду да студэнтаў: псіхалагічная рэлаксацыя адбываецца імгненна! Яны ўсе ўсмешлівыя, вабныя, добразычлівыя, актыўныя і ў вучобе, і ў арганізацыі вольнага часу. Вось і ў арганізацыі юбілею ўзялі на сябе мноства спраў: займаліся рамонтам, вырасцілі кветкі, упрыгожылі факультэт, падрыхтавалі нумары мастацкай самадзейнасці...

Такая атмасфера дабра і цяпла спрыяе выключнай папулярнасці факультэта сярод абітурыентаў. Конкурс у нас ад 4 да 7 чалавек на месца — гэта даволі сур'ёзныя лічбы. Да нас ідуць вучыцца з жаданнем, бо мы даем якасную адукацыю, рыхтуем выхавальніка-даследчыка, на каго і разлічана праграма «Пралеска». Мы ідзём у нагу з жыццём, заўсёды ўлічваем усе тыя змены, што адбываюцца ў дашкольным свеце, тыпах, відах, профілях дашкольных устаноў, змесце іх работы, сістэме адукацыі наогул. Тут нам дапамагае і цеснае супрацоўніцтва з яслямі-садам, аддзеламі адукацыі вобласці.

**— Што ж, бачна, з якім выключным аптымізмам вы сустракаеце 25-годдзе факультэта. Не губляйце яго, няхай ён спрыяе вам і вашаму калектыву ва ўсім. Дабра і новых творчых здабыткаў!**

— Дзякуй!

**Інтэрв'ю ўзяў**
**Алесь САЧАНКА.**

**P.S. Пачынаючы з сённяшняга нумара, мы прапануем чытачам шэраг артыкулаў, падрыхтаваных выкладчыкамі факультэта педагогікі і псіхалогіі дзяцінства Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова.**